Работніца і
калгасніца
Беларусі
1932
№№ 7–12
ЗОК-1
18414


1932
Калгасьніца
Беларусі
№ 7 (152)
8-га Сакавіка

У дзень 8 сакавіка палкае прывітаньне сёстрам па клясе работніцам і працоўным сялянкам капіталістычных краін

Капіталісты наступаюць на жыцьцёвы ўзровень работніц

Ва ўмовах крызісу капіталістычнай гаспадаркі, які ўсё больш паглыбляецца, страшэннага росту беспрацоўя, жорсткага наступленьня капіталу на жыцьцёвы ўзровень усёй рабочай клясы, работніца, як найменш арганізаваная частка яе, у першую чаргу становіцца ахвярай усё больш узмоцненай эксплёатацыі.

У выніку капіталістычнай рацыяналізацыі — зьніжэньня заработнай платы, падаўжэньня і ўшчыльненьня рабочага дня, павышэньня напружанасьці працы, значнага скарачэньня ці скасаваньня сацыяльнага страхаваньня, мерапрыемстваў у галіне аховы жаночай працы і аховы мацеры і дзіцяці,—увесь цяжар гэтай рацыяналізацыі звальваецца на плечы працоўных жанчын.

Капіталісты скарыстоўваюць нізкую аплату жаночай працы для зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню ўсёй рабочай клясы.

Капіталістычная краіна ня ведае роўнай аплаты за роўную працу. Работніца, выконваючы такую-ж работу, як і рабочы атрымлівае толькі частку яго заработку. У Германіі зарплата работніцы складае 60,1 проц., ва Францыі—56 проц., у Англіі—49 проц. зарплаты рабочага.

У камвольнай вытворчасьці Англіі мужчына атрымлівае 55 шылінгаў (1 шыл.—47 кап.) у тыдзень, жанчына—толькі 30 шылінгаў за тую-ж самую працу.

У Германіі сярэдняя тыднёвая заработная плата мужчын складае паводле даных афіцыяльнага абсьледаваньня 1929 году 41,92 маркі (1 марка—46 кап.), а жанчын—22,01 маркі.

У Чэха-Славакіі работніца ў гарбарнай вытворчасьці, працуючы ў цяжкіх і шкодных умовах, атрымлівае ў тыдзень 70—80 крон (1 крона—6 к.) у той час, як мужчыны, якіх яны замянялі, атрымлівалі раней 250-300 крон.

Але гэта нізкая зарплата жанчын, у выніку агульнага наступленьня капіталу на зарплату рабочых, пастаянна яшчэ ўрэзваецца. Так, за першую палову 1930 году сярэдні тыднёвы заработак у баваўняна-папяровай прамысловасьці Англіі зьнізіўся на 3 шылінгі і ў ваўнянай—на 1 шылінг 3 пэнсы.

У Злучаных Штатах Амэрыкі, пачынаючы з 1920 году, зарплата ў тэкстыльнай прамысловасьці няўхільна зьніжалася. Гэта зьніжэньне выявілася ў наступных лічбах: у штаце Георгіі—на 32 проц., Паўночнай Караліне—на 36 проц., і ў Паўднёвай Караліне—на 31 проц.

У Італіі ў 1930 годзе кваліфікаваны рабочы атрымліваў у гадзіну 3,05 ліры (1 ліра—10 кап.), а кваліфікаваная работніца—толькі 1,30 ліры.

У Польшчы ў 1930 годзе ў каменнавугальнай прамысловасьці рабочыя на паверхні атрымлівалі 7,96 злотых (1 злоты—22 кап.) у дзень, а работніцы—3,62 злотых.

У краінах Усходу адставаньне аплаты жаночай працы ад мужчынскай яшчэ большае. У Кітаі зарплата работніцы складае толькі 22,5 проц., заработку рабочага. У Японіі—36,7 проц.

Гэтага мізэрнага заработку не хапае работніцы на здавальненьне самых неабходных запатрабаваньняў. У часе нядаўняй стачкі мэталістаў Бэрліну, на старонках рабочага друку прыводзіўся бюджэт адзінокай кваліфікаванай мэталісткі. Згодна гэтых даных кваліфікаваная работніца заводу Сімэнса, зарабляючая 25 марак у тыдзень, выдаткоўвае 3 маркі на ўзносы ў страхкасу і на падатак на заработную плату, на аплату кватэры—7,50 маркі, на праезд да месца працы—1,80 маркі, на абед—5,80 маркі, на хлеб—75 пфэнінгаў, на ¾ ф. маргарыну—1,35 маркі, на паўфунта каўбасы—1 марку. З 3-х марак, што застаюцца пасьля пакрыцьця гэтых патрэбнасьцяй, яна павінна выкраіць і ўзносы ў прафсаюз, і на адзеньне, і на газэту і на інш. культурныя патрэбнасьці.

Японская работніца, якая зарабляе ў лепшым выпадку 22 іены (іена—98 кап.) у месяц, выдаткоўвае на харчаваньне, кватэру і асьвятленьне 16 іен, на трамвай—2 іены, на адзеньне—1 іену і 3 іены ёй застаюцца на ўсе іншыя патрэбы, у той час, як на адзін толькі апал і на дробязі патрэбна ня менш 7 іен. З гэтай мізэрнай зарплаты прадпрыемцы ўхітраюцца яшчэ прыкішэніць некаторую частку шляхам сыстэмы штрафаў, якая вельмі пашырана амаль ва ўсіх краінах. Работніцы штрафуюцца за гутаркі ў часе работы, за мыцьцё рук у рабочы час, за спазьненьне, за карыстаньне прыбіральняй ці прабываньне ў ёй больш паказанага часу.

У тэкстыльнай прамысловасьці яны штрафуюцца за нязначны брак сыр цу, за абрыў нітак, за вузялкі ў прадзіве.

У Чэха-Славакіі работніцы за брак абкладаюцца штрафам ад 5 да 10 крон, ці звальняюцца з работы на 3 дні, а часамі і на цэлы тыдзень.

У Бэрліне, на фабрыцы Электра-Люкс, у варштаты работніц укладваюцца таемна гадзіньнікі. Калі работніца ідзе па матар'ял ці ў прыбіральню, гадзіньнік адзначае гэты прагул, за які потым вылічваюць з заработку работніцы.

З. Баярская.



Японскія танкі на вуліцах Шанхая.

Зок-1
1844

8-га САКАВІКА

Міжнародны жаночы камуністычны дзень 8-га сакавіка праходзіць у гэтым годзе ва ўмовах, калі капіталістычныя краіны перажываюць найглыбейшы крызіс і абвастрэньне ўсіх капіталістычных супярэчнасьцяй.

Капіталісты пачынаюць усё больш актыўна шукаць выхаду з крызісу ў нападзе на іншыя капіталістычныя краіны, у арганізацыі інтэрвэнцыі супроць СССР. Ідзе ліхаманкавая падрыхтоўка да вайны. Растуць узбраеньні капіталістычных дзяржаў. На Ўсходзе, недалёка ад нашай мяжы, вядзецца самая сапраўдная вайна, хоць яна афіцыяльна нікім не абвешчана, і Ліга нацый упарта ня хоча прызнаць яе вайной. Захват Японіяй Манчжурыі, падзеі на Ўсходзе, спробы імпэрыялістаў стварыць на Ўсходзе антысавецкую „буфэрную" дзяржаву—робяць у гэтым годзе найбольш рэальнай небясьпеку інтэрвэнцыі супроць СССР.

Савецкі Саюз цьвёрда вядзе палітыку міру. Савецкі Саюз зьяўляецца адзінай краінай, якая бароніць на жэнэўскай канфэрэнцыі па „разбраеньні" сапраўднае разбраеньне, у той час, як усе прадстаўнікі капіталістычных краін хочуць пад рознымі размовамі аб разбраеньні ўтаіць усё ўзрастаючыя ўзбраеньні іх дзяржаў.

Савецкі Саюз не паддаваўся і не паддасца ні на якія правакацыі. Аднак **Савецкі Саюз зможа даць самы рашучы адпор усякаму ворагу, які адважыцца на яго напасьці.** Зарука гэтаму—наша магутная Чырвоная армія, наша моцная сацыялістычная гаспадарка.

Савецкі Саюз зьяўляецца адзінай краінай у сьвеце, якая ня толькі не перажывае крызісу, але, наадварот, нябывалымі ў гісторыі тэмпамі будуе сваю сацыялістычную гаспадарку.

Працоўныя Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, на чале з ЦК і праводыром тав. Сталіным, дабіліся ў 1931 годзе **завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.** Пасьпяховае выкананьне плянаў першых трох год пяцігодкі, выкананьня радам галін прамысловасьці пяцігодкі за 2½—3 гады забясьпечылі выкананьне пяцігодкі за 4 гады і стварылі ўмовы для пабудовы сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы. XVII партканфэрэнцыя прыняла дырэктывы да складаньня другой пяцігодкі, якая зьяўляецца канкрэтным плянам пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны, тэхнічная перабудова народнай гаспадаркі выведуць Савецкі Саюз у канцы другой пяцігодкі на першае месца ў Эўропе ў тэхнічных адносінах.

У канцы другой пяцігодкі СССР стане незалежным у тэхніка-эканамічных адносінах ад капіталістычных краін, што значна ўзмоцніць нашу абароназдольнасьць.

Магутная тэхнічная база будзе падведзена і пад сельскую гаспадарку, калектывізацыя якое будзе ў асноўным закончана ў 1932—33 годзе. У канцы другой пяцігодкі машына-трактарныя станцыі ахопяць усе калгасы і ў асноўным завершаць мэханізацыю сельскагаспадарчай вытворчасьці, чым будуць створаны ўмовы да канчатковай ліквідацыі процілегласьці паміж горадам і вёскай. **Значна палепшыцца і матар'яльнае становішча працоўных,** якія ў канцы другой пяцігодкі будуць забясьпечаны прадуктамі ў 2—3 разы больш, чым зараз.

У СССР канчаткова зьнішчана беспрацоўе. Колькасьць рабочых, работніц і служачых за апошнія два гады павялічыдася на 6,2 млн. чалавек, вырасла зарплата рабочых і сярэдні бюджэт рабочай сям'і.

Значна павысіўся і культурны ўзровень працоўных. З кожным годам усё больш павялічваецца і колькасьць працоўных жанчын, якія вучацца ў тэхнікумах, ВНУ і ВТНУ. У БССР да 1-га мая 1932 году будзе канчаткова ліквідавана няпісьменнасьць.

Ў. І. Ленін.

Расьце ўздым рабочых і работніц, што выяўляецца ва ўсё большым разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, якое набывае больш высокія формы—гаспадарча-разрахунковыя брыгады, зьменна-сустрэчныя пляны і інш. Пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва ўцягвае ўсё большую колькасьць працоўных жанчын у актыўны ўдзел у вытворчым і грамадзкім жыцьці краіны. Расьце армія ўдарніц сацыялістычнага будаўніцтва, ня мала ёсьць у нас жаночых гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія паказваюць лепшыя прыклады ў працы. Ня новасьцю зьяўляюцца ў нас жанчыны—старшыя брыгадзіры, майстры, дырэктары.

Вялікія дасягненьні маем мы і ў справе бытавога разьняволеньня працоўнай жанчыны. Няўхільна расьце колькасьць дзіцячых устаноў, сталовак, якія вызваляюць жанчыну для вытворчай і грамадзкай працы. Абавязковае ўсеагульнае дашкольнае выхаваньне пастаўлена ЦК КП(б)Б, як бліжэйшая наша задача.

Зусім іншае становішча працоўных жанчын у капіталістычных краінах. Крызіс выкінуў на вуліцу шмат рабочых і работніц. Расьце мільённая армія беспрацоўных рабочых і работніц, якія разам са сваімі сем'ямі асуджаны на голад і жабрацтва. Шукаючы выхаду з крызісу, капіталісты наступаюць на рабочую клясу зьніжаюць зарплату, павялічваюць рабочы дзень, прасьледуюць штрафамі. Усё гэта выклікае рост рэвалюцыйнага ўздыму працоўных, аб чым сьведчаць масавыя забастоўкі ў Польшчы, Гішпаніі, Галяндыі, Індыі. **Усё большая колькасьць жанчын—работніц і пра-**

Бн 1411
Бн 1953 г.
імені ЛЕНІНА

ноўных сялянак—удзельваюцца ў рэвалюцыйным рух, становяцца пад кіраўніцтвам сваіх камуністычных партый актыўнымі змагарамі за пралетарскую рэвалюцыю—адзіны шлях вызвалення працоўных.

У дзень 8 га сакавіка працоўныя капіталістычных краін будуць дэманстраваць свае сілы на барацьбу з капіталам, супроць новых войнаў, супроць нападу на Савецкі Саюз—бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

Працоўныя жанчыны Савецкага Саюзу павінны цьвёрда памятаць, што СССР—ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту, што ўсякае наша дасягненьне замацоўвае пазыцыі сусьветнага пралетарыяту.

Таму ў дзень 8-га сакавіка баявы абавязак кожнай працоўнай жанчыны Савецкага Саюзу—па-бальшавіцку змагацца за выкананьне пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б. Яшчэ больш узмацніць барацьбу за выкананьне плянаў 1932 году, ажыцьцяўленьнем праграмы якога створым умовы да другой пяцігодкі.

Да 8-га сакавіка не павінна застацца ніводнай дэлегаткі, ніводнай работніцы, па-за радамі ўдарных брыгад, створым новыя жаночыя гаспадарча разрахунковыя брыгады імя 8-га сакавіка, арганізуем зьменна сустрэчныя пляны, паленным якасьць работы брыгад. Больш актыўнасьці ў барацьбе за ажыцьцяўленьне б-ці ўмоў тав. Сталіна, за рацыяналізацыю вытворчасьці, за павышэньне кваліфікацыі. Баявы абавязак кожнай работніцы—змагацца за аўладаньне тэхнікай сваёй справы, павысіць свае тэхнічныя веды.

Змагацца за паляпшаньне якасьці ўсёй нашай работы, асабліва якасьці прадукцыі—наша важнейшая задача.

У галіне сельскай гаспадаркі нашы асноўныя задачы зараз мабілізавацца на падрыхтоўку да веснавой сяўбы, стварэньне насенных фондаў, правільную арганізацыю працы, на аснове ажыцьцяўленьне б і ўмоў тав. Сталіна дабіцца арганізацыйна гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У дзень 8 га сакавіка новыя масы дэлегатак, калгасьніц і саўгасьніц павінны ўліцца ва ўдарныя брыгады.

Барацьба за аўладаньне агратэхнікай, за павышэньне ўраджайнасьці—баявы абавязак працоўных жанчын вёскі. Неабходна дабіцца канчатковага выкананьня і перавыкананьня ўсіх плянаў загатовак, арганізуючы ў дзень 8 га сакавіка чырвоныя абозы збожжа, ільну, мяса і інш.

У галіне жывёлагадоўлі задача дэлегатак, саўгасьніц і калгасьніц—змагацца за пасьпяховае правядзеньне злучной, апароснай і адёлачнай кампаній, захаваньне маладняка, павялічэньне ўдойнасьці.

Неабходна дабіцца наладжаньня працы жаночых вытворчых нарад у тых галінах, дзе пераважна працуюць жанчыны.

Да веснавой сяўбы неабходна сваячасова рыхтаваць дзіцячыя ўстановы, сталоўкі.

Ва ўсёй барацьбе за выкананьне плянаў 4-га заключнага году пяцігодкі дамо рашучы адпор клясаваму ворагу, які будзе імкнуцца падарваць наша пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва.

Неабходна цьвёрда памятаць, што канчатковае вырашэньне пытаньня „хто каго" як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы на карысьць сацыялізму, што пасьпяховая ліквідацыя кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі зусім не азначаюць аслабленьня клясавай барацьбы ў СССР.

Нават і ў другой пяцігодцы яшчэ застанецца клясавая рознасьць, яшчэ прыдзецца весьці барацьбу з буржуазнымі і дробна-буржуазнымі забабонамі, яшчэ застануцца задачы перавыхаваньня калгасьнікаў.

Варожае міжнароднае акружэньне, небясьпека інтэрвэнцыі ставіць перад працоўнымі жанчынамі СССР задачу рыхтаваць да абароны краіны, папоўніць рады Асоавіяхіму. У дзень 8-га сакавіка ўзмоцнім сваю міжнародную сувязь з працоўнымі жанчынамі капіталістычных краін, павялічым рады МОПР'у.

Дэлегаткі, работніцы, калгасьніцы, працоўныя жанчыны павінны ў дзень 8-га сакавіка яшчэ больш згуртавацца вакол ленінскай партыі для барацьбы за яе генэральную лінію, супроць розных адхіленьняў ад яе, супроць скажэньняў ленінізму на практыцы і ў тэорыі. За ленінскую нацпалітыку, супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму і шовінізмаў розных колераў.

Павысім марксыцка-ленінскае выхаванье дэлегатак, работніц і калгасьніц, папоўнім рады партыі лепшымі ўдарніцамі-работніцамі і калгасьніцамі.

Тав. Грудман удзельніца грамадзянскай вайны.

Андрэй Александровіч

Урыўкі з вершаванага раману „НАРАДЖЭНЬНЕ ЧАЛАВЕКА“

Ад варштатаў, ад машын
Дэлегаты краю.
Сыгнал. Спакойна. Пачынаем.
(Пауза)
— Та
ва
ры
шы!
Пад сонцам
Два варожых сьветы:
Агняцьветны
Край Саветаў,
І другі,—
Дзе разьнята
Зямля на краіны,
І, як краіна,
На штаты,
Па штату
Краіна
Там
Мець павінна
Бронемашыны,
І казэматы.
„Сыты галоднаму
Не спагадае“—
Векавая
Пагаворка.
Церпяць рабочыя
І ў Шанхаі,
І ў Бэрліне,
І ў Нью-Ёрку.
За завесаю констытуцый
Скрыгань і шквал барацьбы.
„Паны між сабою б'юцца,
А трасуцца
У мужыкоў чубы“.
Сокалу крыльлі абрэзаць,
Сокал ня будзе лётаць.
Ня стрымаць пралетарскіх
узьлётаў
Ні мітральезай,
Ні кулямётам.
Ад зор і да зор—суткі,
Дваццаць чатыры гадзіны.
Дзяржавы на Захадзе,
Як простытуткі,
Прабіваюцца на рынак.
Рабочы бяз працы.
Чуеш,
У муках народзіцца радасьць.
Галодны паход будуе
Рэвалюцыі
Людзкую
Барыкаду.

Якая розьніца.
Адна-ж бяда—пакута
У ткачоў і Беластоку,
І Лі[illegible]ну,
І Калькуты.
Якая розьніца.
(Хоць шлях змаганьня свой там).
Ці токар з Токіо,
Ці з Вены,
Ці з Дэтройту.
Адным агнём гараць,
Агнём нязгасным,
Вочы.
Ніякай розьніцы. І там
І там рабочыя!
На фронт, таварышы!
На фронт, энтузіасты!
Такія дні
Стракаюцца
Ня часта!
У барацьбе, за працаю
Што дзень сабе прыблізім,
Заваёваны
У баёх
Сацыялізм!
. . . . . .
* * *
Рэжам, клеім і сшываем
І пад прэсам выпраўляем.
Так з старой падранай—мігам
Зробім новенькую кнігу.
Рукі спрытна сёньня ходзяць,
І настрой як сонца бродзіць.
Песьняй гучнай, плаўнакрылай
Асьвяжаем свае сілы.
Кожны дзень адна работа:
Рэжам, клеім пераплёты.
Грамадою—разам, раз—
Мы заканчваем заказ.
* * *
Знак. Перапынак. Поўдзень.
Поўгадзіны. Адпачні.
І, як быццам, так праходзяць
Па чарзе за днямі дні.
Але дзень інакшы сёньня.
Не падобны на другі,—
Ён тугою не палоніць.
Ён ня ведае тугі.
І Марыля так ахвоча
Пра сабе, упяршыню,
Сказ вядзе сябром, а вочы
Поўны палкага агню.
— ...Першы дзень, як грудзі
лёгка дышуць.
Як мары ў казках, змрок тугі
Цяпер праменьні закалышуць
У непрабудны сон сузорнае дугі.
Пагодны дзень. І ў гэты першы,
слаўны,
У іншых колерах перад вачыма
сьвет.
І здань грахоў былых разьбегам
дзён стаптаны,
І ўжо, як ветрамі, замецены іх
сьлед.
Няма таго, няма, што так цярпела
ўчора,
Учарайшы дзень зусім я ня жыла,
Я нарадзілася, калі стапнела гора.
Дарогай вогнішча ў жыцьцё
сваё увайшла.
І вось за працаю і рукі, як другія,
І аркушы папер шасьцяць інак
зусім.
І літары брашур—завуць (яны
жывыя)
На штурм жыцьця запалам
маладым.
Няхай ня полымем мне быць,
я гэта знаю.
Але іскрой, браткі, я мушу быць.
І сёньня
Разам з вамі выступаю,
Як роўны з роўнымі
У навалу барацьбы.

Кутузава за ўдарную працу ўзнагароджана ордэнам Леніна, зараз студэнтка промакадэміі.

Работніцы—актыўныя барацьбіты за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады

Посьпехі першых 3-х год пяцігодкі дасягнуты дзякуючы няўхільнаму правядзеньню генэральнай лініі ленінскай партыі, у барацьбе з ухіламі ад яе.

У дзень 8-га сакавіка неабходна яшчэ больш мабілізаваць шырокія масы работніц і калгасьніц на выкананьне і перавыкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва чацьвертага году пяцігодкі і падрыхтоўкі да другой пяцігодкі—пяцігодкі ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, пяцігодкі падвядзеньня навейшай тэхнічнай базы пад усе галіны народнай гаспадаркі.

У канцы 1931 году ва ўсёй прамысловасьці БССР было занята 39.849 жанчын—работніц, або 40,7 проц., а ў прамысловасьці ВСНГ—больш 50 проц. **На 1932 год, паводле пляну, намечана давесьці лік работніц у прамысловасьці да 62801 або 47,3 проц., па прамысловасьці ВСНГ—55,7 проц.** Выкананьне гэтага пляну зьяўляецца баявой задачай гаспадарчых і прафэсыяналяных арганізацый.

Узрасла вытворчая актыўнасьць шырокіх мас работніц. Па даным 101 прадпрыемства **на 1-І—32 году работніцы ахоплены ўдарніцтвам на 67,5 проц.** па 12 прадпрыемствах саюзу машына-будаўніцтва ахоплена сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам 59 проц. работніць з 1094 работніц, якія там працуюць; па 13 прадпрыемствах саюзу гарбароў—65 пр. з 3211 работніц, па 19 прадпрыемствах саюзу лесдрэўрабочых—70,1 проц. з працуючых 3.059 работніц, па чатырох прадпрыемствах саюзу воўна-шоўк-трыкатаж—80,1 проц. з працуючых 1,848 работніц; па 7-мі прадпрыемствах саюзу мукамольна-хлебна-кандытэрскай прамысловасьці—75,3 проц. з працуючых 752 работніц; па саюзе земляробчых саўгасаў 42 проц.

Заключаны сацдагавары паміж брыгадамі і паасобнымі работніцамі ў саўгасах. **У выніку ўжываньня сацыялістычных мэтадаў працы паасобныя работніцы, а таксама брыгады перавыконваюць нормы выпрацоўкі. У саўгасе „Новы Быт" (Віцебск) работніцы перавыконваюць нормы выпрацоўкі па вывазу гною на 42—60 проц.; у саўгасе „Боркавічы" брыгада жанчын па ўборцы ільну перавыканала норму на 70—100 проц. Ёсьць гасп-разрахунковыя брыгады на скотных дварох.**

На саюзе жывёлагадоўчых саўгасаў у арганізаваных 81 гаспадарча-разрахунковых брыгадах прымаюць удзел 81 проц. жанчын-работніц.

Работніцы актыўна ўдзельнічаюць у гаспадарча-разрахунковых брыгадах: **на панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін ёсьць 51 гаспадарча-разрахунковая брыгада, у якіх пераважная колькасьць жанчыны.**

На запалкавай прамысловасьці на фабрыцы „Х кастрычнік" (Рэчыца), „Пралетарская перамога" (Барысаў) у пераведзеных на гаспадарчы разрахунак брыгадах прымае ўдзел многа жанчын, якія дабіліся зьмяншэньня браку і эканоміі матар'ялаў.

На шчотачнай фабрыцы (Менск) 2 брыгады валасянога цэху дабіліся эканоміі дзякуючы пераходу на гаспадарчы разрахунак. Адна брыгада ў 5 чалавек дабілася за студзень эканоміі—222 руб я, за што атрымала 66 руб. прэміі, другая брыгада ў 4 чалавека дабілася эканоміі ў 148 р., за што атрымала 33 руб. прэміі.



Тав. Стрыжова—ударніца буравачнага цэху шчотачнай ф-кі, г. Менску. Унесла 3 рацыяпалізатарскіх прапановы.

Узрос удзел жанчын-работніц у вытворчых нарадах:

На саюзе мука-хлебным па 5 прадпрыемствах 18,8 проц. прапаноў унесена работніцамі. На 2-х прадпрыемствах саюзу воўна-шоўк 20,2 проц. прапаноў унесена работніцамі. У 15 ячэйках вынаходцаў з 445 членаў ячэек жанчын 28 або 6 пр.

Значна ўзрос процант жанчын, ахопленых прафсаюзным членствам, што відаць з параўнаньня даных на 1 кастрычніка 1931 году і 1-га студзеня 1932 году па раду саюзаў. На саюзе машынабудаўніцтва колькасьць жанчын, ахопленых прафсаюзным членствам павялічылася за гэты час з 68,2 пр. да 82,3 проц., на саюзе электрапрамысловасьці з 50 проц. да 79,4 проц., на саюзе воўна-шоўк-трыкатаж з 68 проц. да 86,1 проц., на саюзе чыгуначнікаў з 9 проц. да 75,8 проц., на саюзе торф-сланцовай прамысловасьці з 29,8 проц. да 54,1 проц., на саюзе шкло-фарфор на 1-е кастрычніка 1932 году—77,8 проц.

Асобная ўвага ў чацьвёртым, завяршальным годзе пяцігодкі павінна быць аддана вылучэньню работніц ударніц на кіруючую гаспадарчую работу, на павышэньне вытворчай кваліфікацыі работніц і ўзьняцьце іх палітычнага і культурнага ўзроўню.

Рыхтуючыся да VII усебеларускага і IX-га ўсесаюзнага зьездаў прафсаюзаў, неабходна мабілізаваць жанчын работніц на выкананьне пастаноў XIV зьезду КП(б)Б і XVII канфэрэнцыі ВсеКП(б), поўнае правядзеньне ў жыцьцё 6-ці ўмоў тав. Сталіна, пасьпяховае правядзеньнн веснавой сяўбы і датэрміновае выкананьне прамфінпляну 1-га кварталу завяршальнага году, які забясьпечыць выкананьне пяцігодкі за 4 гады.

Каждан.

Больш увагі масавай рабоце з новымі работніцамі

(З матар'ялаў рэйду)

Фабрыка „Камунарка" зьяўляецца новай фабрыкай—фабрыкай з ліку „518". На фабрыцы працуе больш 60 проц. работніц, якія па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна.

Работніцы фабрыкі зьяўляюцца ня толькі радавымі работніцамі ля варштату, але-ж ёсьць і шмат работніц, якія стаяць на чале кіраўніцтва брыгадамі, цэхамі, зьменкомамі, намесьнікамі дырэктара, адказнымі работнікамі ў фабкоме.

За апошнія 6 месяцаў вылучана на адказную працу 12 работніц, з іх 2 работніцы зьменнымі майстрамі, 2 работніцы—брыгадзірамі, 6 работніц—старшымі па завёртцы, 3 работніцы—старшынямі зьменкомаў. Вылучаныя работніцы з работай спраўляюцца. Але-ж недахопам зьяўляецца тое, што з імі ня вядзецца належная праца і няма дапамогі ім з боку парт'ячэек і адміністрацыі фабрыкі.

Работніцы ў барацьбе за выкананьне свайго прамфінпляну даюць узорныя паказальнікі сваёй работы, асабліва гэта трэба адзначыць у гаспадарча-разрахунковых брыгадах, якія складаюцца з адных толькі работніц і ідуць наперадзе ўсіх брыгад фабрыкі. Брыгады гэтыя наступныя:

У мякка-чакалядным цэху ідзе наперадзе брыгада завёртшчыц—тав. Сындлер, якая перайшла на гаспадарчы разрахунак і дае ўвесь час перавыкананьне прамфінпляну. За апошнюю дэкаду выканан прамфінпля на 128 проц.—заданьне 4760 кілё, а выканана 6063 кілё. **Узьнялася і якасьць прадукцыі, зьменшыўся брак. Брыгада вядзе барацьбу за поўнае зьнішчэньне браку.**

У карамельным цэху ідзе наперадзе брыгада тав. Тайц з майстэрскага штату. **Брыгада перайшла на гаспадарчы разрахунак у студзені месяцы і дае таксама перавыкананьне прамфінпляну. За апошнія 15 дзён прамфінплян выканан на 105 проц.; якасьць прадукцыі палепшылася.**

Дрожджавы цэх, дзе працуюць выключна адны работніцы, таксама перавыконвае прамфінплян, які за студзень месяц выканан на 112 проц.

Апрача ўказаных брыгад ёсьць яшчэ рад брыгад, якія таксама даюць узорныя бальшавіцкія тэмпы ў сваёй рабоце. Яны ўзялі на сябе абавязак да 8 сакавіка перайсьці на гаспадарчы разрахунак і абвясьцілі сябе ўдарнымі брыгадамі імя 8-га сакавіка.

Тав. Казак ударніца ф-кі „Камунарка" рэдактар штодзёнкі.

На фабрыцы дасягненьнем зьяўляецца і сацбытавое абслугоўваньне работніц. Адкрыты для дзяцей работніц ясьлі, якія будуць працаваць на ўсіх трох зьменах, сталоўка і буфэт абслугоўваюць усе тры зьмены, ЗРК працуе на дзьвёх зьменах.

Тэхвучобай работніцы ахоплены на 80 проц., уведзена восьмая гадзіна тэхвучобы, за апошнія шэсьць месяцаў пераквалiфікавана 30 работніц - завёртшчыц на больш адказную работу.

Удзел работніц у вытворчых нарадах і рацыяналізатарскіх прапановах невыстарчальны. За апошнія 4 месяцы работніцамі ўнесена ўсяго 25 прапаноў, з якіх 15 рэалізаваны і далі некаторае паляпшэньне ў працы. Вучоба работніц праходзіць слаба—усяго ахоплена партвучобай 28 работніц, прафгурткамі—12 работніц, лікпункты наведваюць 55 работніц з 58 няпісьменных.

Ваенізацыяй работніцы ахоплены таксама мала, слаба працуюць стралковыя гурткі, санітарная каманда Чырвонага Крыжу ахапляе 40 работніц і працуе з перабоямі, каманды СПА складаюцца з 70 проц. работніц, але-ж яны на сёняшні дзень працуюць яшчэ слаба.

Асноўны недахоп—гэта тое, што масавая работа асобна сярод новых работніц амаль-што зусім не праводзіцца. Уся масавая работа праходзіць агулам сярод усіх рабочых.

У масавай рабоце не адрозьніваюць старых работніц з 20—25-гадавым вытворчым стажам, ад работніц з 5—6-месячным вытворчым стажам. Таксама няма розьніцы ў падыходзе да работніц, прышоўшых з вёскі—калгасьніц, аднаасобніц, і з гораду—жонак рабочых, дзяцей рабочых, сматужніц і г. д. Гэтым пытаньнем мала займаліся кіруючыя органы цэхаў і ўсёй фабрыкі.

Усё гэта кажа за тое, што парткалектыў фабрыкі „Камунарка" яшчэ не перабудаваў сваю масавую работу па новаму згодна ўказаньняў тав. Сталіна.

Пры парткалектыве жанарганізатара няма, няма іх таксама і пры парт'ячэйках. Парткалектыў і парт'ячэйкі зусім мала зварачаюць увагі на масавую работу сярод новых работніц.

У часе рэйду створаныя брыгады з 30 работніц па праверцы становішча масавай работы сярод работніц займаліся ня толькі праверкай, але адначасова дапамаглі і ў наладжаньні працы, у выніку **ў часе работы брыгады па цэхах перавезена 5 брыгад на гаспадарчы разрахунак. Гэтыя брыгады абвясьцілі сябе ўдарнымі брыгадамі імя 8 га сакавіка. Праведзена падпіска на часопіс „Работніца і калгасьніца Беларусі" на 120 экз. Падрыхтаваны для перадачы ў партыю да 8 сакавіка 4 работніцы.**

Кіраўніцтва фабрыкі павінна прыняць усе крокі да ліквідацыі наяўных недахопаў у пастаноўцы масавай работы сярод работніц і перабудаваць яе на аснове ажыцьцяўленьня 6-ці ўмоў т. Сталіна.

Брыгада часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі" і шматтыражкі „Камунарка": Грынглаз, Слаўковіч, Крыўчык, Муха, Ступіна, Тарасевіч, Крыўчык, Подостровец, Сіндлер, Крэмер, Радкевіч, Мерсон, Лазоўская, Каган, Янчэўская, Нодэльман, Берэнштэйн, Царфіна, Казак, Раманчык, Сідарэнко, Лесьнічая.

8-га сакавіка яшчэ больш узьнімем актыўнасьць шырокіх мас работніц у барацьбе за выкананьне ўсіх плянаў 4-га заключнага году пяцігодкі

Створым новыя жаночыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады

Лепшыя работніцы-ўдарніцы ўступаюць у партыю

На фабрыцы „Камунарка“ працуе большая частка новых работніц, якія да гэтага часу ваявалі з гаршкамі і плітой, а цяпер зьяўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі ў будаўніцтве сацыялізму.

8-е сакавіка ў нас зьяўляецца праверкай усёй працы. У гэты дзень мы павінны адзначыць усе дасягненьні і недахопы, якія ёсьць у нашай працы.

У нашай зьмене працуе 70 работніц, усе ахоплены прафсаюзамі, запазычанасьць па членскіх узносах ліквідавана, прарыў па фінпляне ліквідавалі датэрмінова, няма ніводнай работніцы без павыкі, усе зьяўляюцца ўкладчыцамі ў ашчадкасы. Дзьве брыгады пераходзяць на гаспадарчы разрахунак, адна з іх прыняла назву 8-га сакавіка.

Дзьве лепшыя работніцы—тав. **Маршак** з 17-цігадовым вытворчым стажам і тав. **Сасноўская** з 4-х гадовым вытворчым стажам рыхтуюцца да 8-га сакавіка ўступіць у партыю і адна работніца ў камсамол.

На часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ падпісалася 30 работніц. Побач з дасягненьнямі ў нас ёсьць і недахопы. Прамфінплян недавыканан на 2—3 проц., адна работніца—тав. Доўнэр зьяўляецца няпісьменнай, яна адмаўляецца ліквідаваць сваю няпісьменнасьць. Ёсьць яшчэ рвацкія настроі ў некаторых работніц. Напр., т. Запольская, член ЛКСМ, грамадзкай працы ніякай ня хоча выконваць, а калі ёй даручыш што-небудзь, то яна кажа—дай талён, буду тады дапамагаць. Работніцы бяруць на сябе абавязак ліквідаваць поўнасьцю ўсе недахопы да 8-га сакавіка.

Брыгада: час. „Раб. і калг. Беларусі“ і шматтыражкі „Камунарка“—**Радкевіч, Мэерсон, Беленькая.**

т. Каплан—ударніца Гомсельмаша, сакр. яч. ЛКСМБ.

Прамфінплян выканалі датэрмінова

Наша шаўковая істужка (ф-ка „Кастрычнік“, гор. Менск) уключылася ва ўнутрыфабрычны рэйд на лепшыя колькасныя і якасныя паказальнікі выкананьня прамфінпляну, маючы ў сваёй працы прарыў.

Задача перад работніцамі і рабочымі нашай істужкі стаяла вялізарная,—ня толькі ліквідаваць прарыў, але і абавязкова выканаць датэрмінова прамфінплян да 25/II.

Ударніцы і ўдарнікі нашай істужкі па-бальшавіцку змагаліся за ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну. Разгарнулі шырокае сацспаборніцтва, высоўвалі штодзенныя сустрэчныя пляны, даводзілі гэтыя пляны да кожнага варштату, рэгулярна выпускалі штодзенку, якая біла па зрыўшчыках працы і дапамагла наладжаньню працы. У выніку мы перамаглі.

т. Герасіменка, Ф.—ударніца аўтаматнага цэху ф-кі „10 кастрычнік“, г. Рэчыца.

Баявое заданьне — выканаць прамфінплян да 25-II — наша істужка з гонарам за 6 дзён да тэрміну выканала.

Работніцы і рабочыя нашай істужкі паставілі сабе і надалей задачы: **давесьці брак (перароб-кі) да нуля і змагацца за лепшую якасьць.**

Справілися з першай задачай—выкананьнем прамфінпляну. **Упэўнены, што справімся і з другой—дамо добрую якасьць.**

Работніца шаўковай істужкі **Падольская.**

Штодзенка па-бальшавіцку змагаецца за прамфінплян

Штодзенка дрожджавага цэху, які складаецца з адных работніц, увесь час змагаецца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, вядзе рашучую барацьбу з прагуламі і сымуляцыяй, адбівае на сваіх старонках добрыя і адмоўныя бакі працы цэху. Штодзенка дапамагла выкананьню прамфінпляну за студзень месяц на 112 проц.

Вакол штодзенкі ёсьць актыў рабкорак з 8 работніц.

Кавак.

Менск, ф-на „Камунарка“.

Конкурс на лепшую гаспадарча-разрахунковую брыгаду ўзьняў актыўнасьць работніц

Конкурс на лепшую гаспадарча-разрахунковую брыгаду, абвешчаны ў сьнежні на панчошнай ф-цы імя Клары Цэткін, ня толькі падняг**нуў** у працы існуючыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады, але і даў значны штуршок да арганізацыі новых разрахунковых брыгад.

За час конкурсу **колькасьць брыгад павялічылася з 22 да 51.** 16-II былі падведзены вынікі конкурсу.

Вязальны цэх—вядучы цэх—амаль на 100 проц. ахоплен гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі. Швэйны цэх, дзякуючы ўзорнай працы гаспадарча-разрахунковых брыгад, пачаў сваячасова выконваць прамфінплян. **За час конкурсу 15 лепшых ударніц уступілі ў партыю і 7 у камсамол. У брыгадах амаль зьніклі спазьненьні на работу.**

Кожны брыгадзір у сябе ў брыгадзе вядзе ўлік выдаткаваных іголак шляхам штодзенных вестак на дошцы, а таксама і іншага сырцу.

Зьменна-сустрэчнае пляніраванье пачалося ў брыгадах Масарскай і Цыпэрсон у вязальным цэху. Прыклад гэтых брыгад хутка падхапілі іншыя брыгады. **У сучасным момант зьменна-сустрэчнае пляніраваньне праводзіцца ў 12 брыгадах, у якіх арганізаваны пляна-арганізацыйныя групы.**

На фабрыцы існуе рад гурткоў па ўладаньні тэхнікай, якія рэгулярна працуюць і добра наведваюцца.

Па фінішы (пяршынства ў конкурсе) ідуць брыгады наступных т.т. **Афонінай і Ткачовай па мацальным цэху, Цыпэрсон, Скоблавай, Віхман і Зінгеровіч—па вязальным цэху, Шаўрынай, Восіпавай, Анушэнка, Дзячук і Ліз-банавай—па швэйным цэху.**

Падводзячы падагуленьне конкурсу патрэбна адзначыць, што зроблена яшчэ ня ўсё. **Якасьць прадукцыі кульгае—у брыгадзе Кавалеўскай**—5 проц. захаванай штопкі.

Няма пастаянных ясьлей і дзіцячага саду. Якасьць абедаў у фабрычнай сталоўцы дрэнная. Ня ўсе работніцы яшчэ ліквідавалі сваю няпісьменнасьць.

Брыгада часопісі „Раб. і калг. Бел." і шматтыражкі „Панчошніца" **Эпштэйн, Шухрова, Хаэральсон.**

раскладчыц, другая абрэзчыц.

5 работніц вылучаюцца на больш кваліфікаваную работу і адна ў якасьці памочніка загадчыка заводзкай сталовай.

Складзена брыгада работніц для выезду ў падшэфны сельсавет. Калгасьніцы з падшэфнага калгасу ў часе сьвята прыедуць на завод.

Рад работніц рыхтуюцца ў дзень 8 га сакавіка ўступіць у партыю і ЛКСМ.

На заводзе зараз праводзіцца рэйд па праверцы масавай працы з работнідамі. Выпускаюцца да 8-га сакавіка спэцыяльныя нумары шматтыражкі і штодзенак.

Мінкін.

Абавязуемся...

6 работніц брыгады тав. Крэмер маюць вытворчы стаж у сярэднім кожная 15 год. Брыгада працуе па-ўдарнаму і прамфінплян перавыконвае. У часе падрыхтоўкі да 8 га сакавіка брыгада ўзяла на сябе наступныя абавязкі:

Да 8-га сакавіка перайсьці на гаспадарчы разрахунак, больш аддаваць увагі парт. і тэхн. вучобе, усёй брыгадзе падпісацца на час. „Раб. і калг. Беларусі".

Па даруч. брыгады: **Крэмер.**

Менск, ф-ка „Камунарка".

Работніцы актыўныя рацыяналізатары

Работніцы акулярнай фабрыкі (г. Віцебск) **нароўні з рабочымі прымаюць удзел у рацыяналізатарскай рабоце.**

Работніца **Барсук — ударніца, рабкорка—прэміявана за рацыяналізатарскую прапанову.** Работніца **Голубева два разы прэміявана за ўнясеньне рацыяналізатарскіх прапаноў. Яе прапановы далі фабрыцы 896 руб. эканомii.** Зараз тав. Голубева накіравана на курсы рацыяналізатараў. **Рацыяналізатарскія прапановы работніцы Бязносавай далі фабрыцы 440 руб. эканомii.** Апрача гэтага ёсьць і рад іншых работніц, якія бяруць актыўны ўдзел у рацыяналізатарскай рабоце.

На фабрыцы ёсьць ячэйка выналодцаў у складзе 44 асоб, **10 чалавек з іх работніцы.**

Усё-ж работніцы акулярнай фабрыкі слаба ахоплены ўдарніцтвам. **З 546 работніц фабрыкі ўдарніцтвам ахоплена толькі 249.**

У часе падрыхтоўкі **да 8-га сакавіка** трэба завастрыць гэта пытаньне і ўцягнуць новых работніц у рады ўдарніц, арганізаваць ударныя гаспадарча-разрахункавыя брыгады імя 8-га сакавіка.

Грумбіна.

Завод „Бальшавік" рыхтуецца

На заводзе „Бальшавік" разгарнулася шырокая праца па падрыхтоўцы да 8-га сакавіка.

Па ўсіх цэхах праведзены гутаркі аб міжнародным жаночым дні. **Арганізуюцца дзьве жаночыя ўдарныя брыгады імя 8-га сакавіка. Адна брыгада рэвчыц і**

т. Нахамава—ударніца зав. „Бальшавік" (Менск) выступае на сэс і ЦВК СССР.

Узмацнім міжнародную сувязь пралетарак!



У ніжнім радзе зьлева направа: 1. Штампоўшчыцы ачковай фабрыкі—лепшыя ўдарніцы Сагаловіч і Ісаковіч. 2. Екельчык — ударніца 3-га агрэгату швэйнай ф-кі „Кастрычнік". 3. Нічыпарчук—фрэзэроўшчыца, лепшая ўдарніца стандартнага цэху Бабруйскага дрэваапрацовачнага камбіната. 4. Янчэўская—рэдактар штодзёнкі карамельнага цэху ф-кі „Камунарка", г. Менск. 5. Голуб—лепшая ўдарніца заводу Варашылава (Менск). 6. Воранава—ударніца з калгасу імя Шаранговіча. 7. Фрэйнклах—лепшая ўдарніца 3-га агрэгату ф-кі „Кастрычнік". 8. Крывіцкая—ударніца гаспадарча-разрахунковай брыгады дрэваапрацовачнага заводу.

Пасярэдзіне ў крузе: ударніца-сьвінарка т. Скрыпнікава, прэміявана за добры догляд маладняка. Работніца ясьляў корміць дзіця. (Ясьлі ф-кі „Кастрычнік"). Камсамолка-трактарыстка Мчэдліщвілі—актыўная культпрацаўніца калгасу, пад яе кіраўніцтвам ліквідавалі няпісьменнасьць 40 калгасьніц. Лепшая ўдарніца-тарфяніца, якая выконвае норму на 175 проц. Ударніца з тэкстыльнай ф-кі Іванава-Васьнясенску.

З левага боку: Завалкава—ударніца беладрэўнага цэху Бабруйскага дрэваапрацовачнага камбінату. Краскоўская Фёкла—кіраўнік вытворчага сэктару ў зьмене на запалкавай ф-цы ў Рэчыцы. Гразьнюкова—трактарыстка, 4 разы прэміявана за эканомію гаручага.

Расьце актыўнасьць калгасьніц у калгасным будаўніцтве

У дзень 8-га сакавіка пралетаркі ўсіх капіталістычных краін будуць рабіць агляд сваіх рэвалюцыйных сіл, якія ідуць пад сьцягам Камуністычнага Інтэрнацыяналу на барацьбу з сусьветным капіталізмам.

Дзень 8-га сакавіка ў Савецкім Саюзе праходзіць у абставінах вялізарнейшых посьпехаў, якія атрыманы ў будаўніцтве сацыялізму ў нашай краіне.

У мінулым 1931 годзе—3-м рашаючым годзе пяцігодкі—рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, завяршыла пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Пытаньне „хто каго" вырашана на карысьць сацыялізму як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Больш паловы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў калгасы. Партыя і савецкая ўлада маюць моцную апору на вёсцы ў асобе калгасьнікаў і калгасьніц, якія зьяўляюцца непасрэднымі будаўнікамі сацыялізму на вёсцы. Калгаснае сялянства зьяўляецца зараз асноўным вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі. Пераважная частка таварнай сельскагаспадарчай прадукцыі здаецца (прадаецца) дзяржаве калгасьнікамі.

Брыгада сьвінарак з калгасу „Случ" Слуцкага раёну.

У справе арганізацыі калгаснай вытворчасьці ёсьць значныя дасягненьні. На першае студзеня 1932 году арганізавана 1250 малочна-жывёлагадоўчых таварных калгасных фэрм са стадам у 89 т. ш. Сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрм—1750 са стадам у 80 тысяч сьвінаматак, цялячых фэрм—1039 з колькасьцю 47291 цялят. Арганізавана 7 інкубатарных станцый, ёсьць 185 птушніцкіх калгасных фэрм, у якіх налічваецца 44.530 курэй.

Значна ўзрасла машынаўзброенасьць калгасаў. Калі ў 1930 годзе калгасы мелі каля 900 касілак і 200 жнявярак, то ў 1931 годзе калгасы маюць касілак 3590, жнявярак—6740 шт., снопавязалак—182, грабель конных—3150, ільнацерабілак—509 і шмат іншага сельскагаспадарчага складанага інвэнтару. На першае студзеня 1932 году на калгасных палёх працавала 1140 трактараў, з 33 машына-трактарных станцыі.

Палепшыліся бытавыя ўмовы жыцьця калгасьнікаў і калгасьніц. У часе веснавой сяўбы мінулага году арганізавана 2132 дзіцячых ясьляй, 544 пляцовак і 546 сталовак.

Пералічаныя дасягненьні атрыманы дзякуючы правільнаму правядзеньню ў жыцьцё генэральнай лініі партыі ў справе калгаснага будаўніцтва.

Разам са шпаркa ўзрастаючымі тэмпамі калгаснага будаўніцтва наглядаецца рост удзелу жанчын у гэтым будаўніцтве. Разгортваецца актыўнасьць жанчын-калгасьніц, узрастае культурна-палітычны ўзровень іх. Тысячы калгасьніц-ударніц працуюць на калгасных палёх, на фэрмах па доглядзе жывёлы і паказалі лепшыя прыклады работы.

У калгасе „Чырвоны Перакоп", Гарадоцкага раёну, ударная брыгада па цярабленьні ільну прынятую норму—10 чалавек на 1 га—перавыканала на 20 проц. У калгасе імя Энгельса, Уваравіцкага раёну, ударная брыгада па капаньні бульбы прынятую норму—25 чал. на 1 га—перавыканала на 80 проц. У СТКФ калгасу „Чырвоны партызан", Крычаўскага раён. 3 калгасьніцы-ударніцы даглядаюць 350 сьвіней і з работай спраўляюцца добра. У калгасе імя Энгельса, Уваравіцкага раёну, брыгада з 27 чал. даглядае і доіць 520 кароў. **Дзякуючы ініцыятыве лепшых ударніц, у гэтым калгасе канчаткова ліквідавалі абязьлічку і ўсе работы перавялі на зьдзельшчыну.** Як вынік гэтага, павялічыліся ўдоі малака, лепш сталі захоўвацца цяляты.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што жанчыны-калгасьніцы слаба вылучаюцца на кіруючую працу. Калі ў параўнаньні з 1930 годам мы ў 1931 г. мелі колькаснае павялічэньне калгасьніц на рабоце па доглядзе жывёлы, то ў справе вылучэньня іх на кіруючую працу па жывёлагадоўлі мы маем зусім нездавальняючае становішча. Па 550 СТКФ загадчыкамі фэрм працуюць толькі 24 жанчыны, або 4,3 проц. Па 265 МТКФ жанчын працуе загадчыкамі 11 чалавек, або 4,1 проц., па 47 ПТКФ жанчын працуе загадчыкамі фэрм 6 чалавек, або 14,5 проц.

Мала жанчын на кіруючай выбарчай рабоце ў калгасах. Паводле даных 68 раёнаў, па 1838 калгасах мы маем жанчын—старшынь калгасаў 6,6 пр., членаў праўленьняў—23,7 проц. і членаў рэвізійных камісій—20,2 проц. З усяго ліку слухачоў курсаў розных кваліфікацый жанчын—17,3 проц.

Слаба прыцягваюцца жанчыны да працы на складаных сельскагаспадарчых машынах і трактарах. З агульнага ліку 2798 трактарыстаў жанчын—254, або 9,1 проц. Работа жанчын на сявярках, касілках і інш. зьяўляецца рэдкім зьявішчам.

Наглядаецца зусім нізкі процант скарыстаньня жаночай рабочай сілы ў паасобных калгасах. Паводле даных 10-ці апорных калгасаў НДІ (навукова дасьледчага інстытуту) за першую палову 1931 году ў гэтых калгасах была скарыстана жаночая рабочая сіла толькі на 24 проц.

Неабходна зараз-жа на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні мабілізаваць жаночыя калгасныя масы на гэту справу. **У кожным калгасе патрэбна арганізаваць брыгады, вызначыць кожнай брыгадзе зямельныя вучасткі пасеваў, замацаваць іх за брыгадай, а ў брыгадзе за кожным калгасьнікам, ін-**

8 САКАВІКА АРГАНІЗУЕМ НОВЫЯ ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ САЎГАСЬНІЦ, КАЛГАСЬНІЦ, ПРАЦОЎНЫХ СЯЛЯНАК ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Калгасьніцы Чэрыкаўшчыны рыхтуюцца да 3-яй бальшавіцкай вясны

14-га лютага адбылася раённая канфэрэнцыя жанчын-калгасьніц ударніц Чэрыкаўскага раёну, на якую зьявілася 80 жанчын.

Канфэрэнцыя абгаварыла пытаньне аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, аб сацыялістычнай жывёлагадоўлі, падрыхтоўцы ясьляй і дзіцячых садоў да веснавой пасеўнай кампаній.

Адна за другой у сваіх выступленьнях калгасьніцы асьвятлялі працу сваіх калгасаў, выкрываючы недахопы і выклікаючы ўсіх калгасьніц да барацьбы з імі і жорсткай барацьбы з кулацкімі элемэнтамі.

Калгасьніца **Рабцава** з калгасу „Серп і молат" паведаміла, што ў мінулым годзе заможная частка прасьледвала ўдарніц, якім кідалі каменьні ў вокны. Але-ж, ня гледзячы на гэта, яны заявілі, што праводзілі і будуць праводзіць ударную працу, выкрываючы клясава-варожыя элемэнты ў калгасе.

Пытаньне павышэньня ўраджайнасьці ўсебакова было абгаворана калгасьніцамі. Выступленьне аднэй калгасьніцы супроць ужываньня попелу атрымала належны адпор. Калгасьніцы **Кукчына, Рабцава, Генэралава** даказвалі з практыкі сваіх калгасаў мэтазгоднасьць угнойваньня попелам.

Канфэрэнцыя абвясьціла сябе мабілізаванай на правядзеньне веснавой сяўбы. Удзельніцы канфэрэнцыі абавязаліся мабілізаваць усіх іншых жанчын іх вёсак на гэту справу.

Канфэрэнцыя выказалася за адчыненьне ў кожным калгасе ясьляй, мабілізаваўшы на гэту справу ўнутраныя рэсурсы калгасу.

Блях.

Дэлегаткі-саматужніцы ў дапамогу калгасам

Дэлегацкі сход саматужніц і жонак саматужнікаў гораду Чэрыкава, абгаварыўшы пытаньне аб падрыхтоўцы да 3-яй бальшавіцкай веснавой пасеўнай кампаніі, **разьбіліся на 4 брыгады, для дапамогі калгасам у веснавой пасеўнай кампаніі.**

Сход пастанавіў сабраць кожнай ня менш 3-х пудоў попелу. Брыгады мяркуюць абыйсьці ўстановы і прыватныя дамы для збору попелу.

На гэтым-жа сходзе былі **вылучаны дзьве брыгады на зборы падпіскі на часопісь „Раб. і калгасьніца Бел.". Блях.**

Забылі пра ясьлі

У калгасе „КІМ", Полацкага раёну, зусім забылі, што да веснавой пасеўнай кампаніі трэба рыхтаваць дзіцячы сад.

Памяшканьня для саду яшчэ не адшукалі. Людзей для працы ў садзе таксама ня рыхтуюць. Трэба, каб праўленьне калгасу, пакуль ня позна, узялося за гэту справу.

А. Л.

(Працяг).

вэнтар, коней, збрую, перавозныя сродкі. На скотных дварох і фэрмах неабходна арганізаваць пастаянныя брыгады, устанавіць нормы выпрацоўкі і адзенку працы на выхадзе прадукцыі.

Патрэбна рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне лёзунгу—„хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымлівае". **Шэсьць умоў тав. Сталіна павінны выявіцца ключом да вырашэньня пытаньня арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.**

Дзень 8 га сакавіка павінен праходзіць пад лёзунгам праверкі падрыхтаванасьці калгасаў да веснавой сяўбы, пад лёзунгам рашучай барацьбы з кулаком і падкулачнікам, якія вядуць работу супроць калектывізацыі, пад лёзунгам арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Калгасьніцы ўдарніцы, дэлегаткі павінны быць у першых радох барацьбітоў за ажыцьцяўленьне гэтых лёзунгаў.

А. Залескі.



Амэрыканскі спэцыяліст абучае работніцу Сідараву прыёмам бракоўкі радыятараў (Сталінградзкі трактарный зав.).

Удзел працоўных жанчын у савецкім будаўніцтве

Рабочая кляса Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам, у барацьбе з апартуністычнымі хістаньнямі ў сваіх радох дасягнула вялізарных посьпехаў у справе індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі стварыла ўмовы для канчатковага эканамічнага і бытавога разьняволеньня працоўнай жанчыны. Ленін казаў: „Кастрычніцкая рэвалюцыя падрэзала карэньні прыгнечаньня і няроўнасьці жанчыны так глыбока, як ня марыла падрэзаць іх ні адна партыя, ні адна рэвалюцыя ў сьвеце, але для сапраўднай роўнасьці яе з мужчынай трэба, каб была грамадзкая гаспадарка і **каб жанчына прымала ўдзел у агульнай вытворчай працы**".

Вялізарнейшы рост нашай прамысловасьці і калектывізацыя сельскай гаспадаркі ліквідавалі беспрацоўе і стварылі ўмовы, калі новыя і новыя тысячы работніц, жонак рабочых, сялянак улываюцца ў прамысловасьць, у калгасы і становяцца актыўнымі барацьбітамі сацыялістычнага будаўніцтва.

З году ў год узрастае актыўнасьць найшырэйшых мас працоўных жанчын у савецкім будаўніцтве і іх роля ў саветах—органах дыктатуры пралетарыяту.

Значна павялічылася актыўнасьць работніц і сялянак у апошніх перавыбарах саветаў. У 1929 г. яўка работніц на выбары складала 61,7 проц.; сялянак—42 проц. У 1931 годзе ў выбарах прымала ўдзел 79,6 проц. работніц і 54 проц. сялянак.

Сыстэматычна ўзрастае ўдзельная вага жанчын у складзе гарадзкіх і сельскіх саветаў. У 1929 г. работніц у складзе гарсаветаў было 24,6 проц., у 1930 годзе—каля 31 проц.; сялянак у складзе сельсаветаў у 1929 г. было 19,6 проц., у 1931 годзе—24 проц.

Узрасла таксама ўдзельная вага жанчын у складзе прэзыдыўмаў сельсаветаў з 14,8 проц. у 1929 годзе да 18,4 проц. у 1931 годзе; у складзе рэвізійных камісій—з 11,4 проц. да 13,8 проц., у складзе райвыканкомаў—з 17 проц. да 20 проц.

У мэтах узьняцьця кваліфікацыі жанчын—членаў сельсаветаў, павышэньня іх палітычнага і культурнага ўзроўню праведзены цэнтральныя 1½ месячныя курсы жанчын-старшынь і членаў саветаў, якія ахапілі 90 чал., у некаторых раёнах праводзіліся 5—10-дзенныя курсы жанчын—членаў саветаў (Касьцюковічы, Бялынічы). Як сталы мэтад падрыхтоўкі жанчын—членаў саветаў, у большасьці раёнаў праводзяцца раённыя нарады іх па пытаньнях чарговых палітычных і гаспадарчых кампаній.

Удзел жанчын у сэкцыях сельскіх саветаў, сельскагаспадарчых вытворчых нарадах, групах беднаты характарызуецца наступнымі данымі (паводле вестак з 41 раёну): У сэкцыях сельсаветаў прымае ўдзел 18,8 проц., у сельскагаспадарчых вытворчых нарадах—24,8 проц., у групах беднаты пры сельсаветах—19,8 проц., пры калгасах—55,5 проц., іншых арганізацыях—24,1 проц. у дэпутацкіх групах пры саветах і МТС—11,1 проц.

Рад сельсаветаў зьвярнулі на работу сярод жанчын належную ўвагу. У выніку наглядаецца шмат прыкладаў, калі для пасьпяховага правядзеньня раду палітычных і гаспадарчых кампаній арганізаваліся спэцыяльныя жаночыя брыгады на чале з жанчынамі—членамі саветаў, якія паказалі бальшавіцкія тэмпы работы. Напрыклад, у Лучнікоўскім і Івана-Агародніцкім сельсаветах, Слуцкага раёну, **жанчыны—члены саветаў зьяўляюцца ініцыятарамі ўдарніцтва па правядзеньні палітычна-гаспадарчых кампаній. У Лучнікоўскім сельсавеце жаночым актывам арганізаваны два чырвоныя абозы па здачы збожжа і адзін абоз па здачы ільну. У Рагачоўскім раёне жанчыны—члены саветаў адыгралі вялікую ролю ў арганізацыі спэцыяльных брыгад па дапамозе адстаючым калгасам з боку аднаасобнага сэктару**; у Любаньскім раёне члены сельсаветаў—жанчыны (калгасьніцы, вылучаліся брыгадзірамі, арганізоўвалі ўдарныя жаночыя брыгады, зьяўляліся застрэльшчыцамі правільнай арганізацыі працы ў калгасах. Тое-ж самае наглядаецца і ў радзе іншых раёнаў. У Касьцюковіцкім раёне ў жаночых брыгадах шырока былі разгорнуты сацыялістычныя мэтады працы, нават паміж асобнымі жанчынамі ў брыгадзе заключалася сацспаборніцтва. У Лоеўскім раёне жаночыя брыгады арганізоўваліся па ўсіх калгасах.

Казлова—старшыня Дамаларыцкага с/с, Клімавіцкага раёну.

Жанчыны—члены саветаў і савецкі жаночы актыў значна дапамагаюць у арганізацыі і рабоце культасьветных і бытавых устаноў: наглядаюць за наведваньнем дзецьмі школ, за працай лікпунктаў, за ліквідацыяй няпісьменнасьці. У Слуцкім, Кармянскім і Жлобінскім раёнах амаль усе дзіцячыя ясьлі і пляцоўкі арганізоўваліся па іх ініцыятыве.

Разам з гэтым трэба адзначыць, што вылучэньне жанчын на кіруючую работу ў саветах яшчэ слабае, аб чым сьведчыць паніжэньне процанту жанчын у складзе старшынь сельсаветаў з 8,3 проц. у 1929 годзе да 5,4 проц. у 1931 годзе і ў складзе сакратароў. Ня гледзячы на пастанову Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту аб замацаваньні на рабоце жанчын—старшынь сельскіх саветаў, аказаньні ім сталай дапамогі і інструктаваньня—ёсьць рад выпадкаў, калі жанчын здымаюць з работы ў саветах бяз усякага папярэдняга абсьледваньня, быццам-бы яны ня справіліся з работай. Напрыклад, старшыня Слабодзкага сельсавету, Мазырскага раёну, тав. Касьцюковіч, член РВК, сялянка-бяднячка з работай у асноўным спраўлялася, сельсавет па выкананьні гаспадарчых кам-

паній пры яе кіраўніцтве быў на першым месцы. Касьцюковіч вяла жорсткую клясавую барацьбу. РВК і мясцовая парт'ячэйка зьнялі яе з работы, „як падаўшую заяву аб зьняцьці", калі на самой справе яна заявы не падавала.

Зусім невыстарчальнае вылучэньне жанчын на адказную работу ў раённых выканаўчых камітэтах і гарадзкіх саветах: у сучасны момант на пасадах старшынь і намесьнікаў раённых выканаўчых камітэтаў няма ніводнай жанчыны, сакратарамі раённых выканаўчых камітэтаў—3 жанчыны, старшынямі гарсаветаў—2 жанчыны.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што да гэтага часу ёсьць з боку паасобных райвыканкомаў і саветаў недаацэнка ролі жанчын на кіруючай рабоце ў саветах. Саветы і райвыканкомы слаба забясьпечваюць уцягненьне жанчын у практычную штодзенную работу саветаў. У радзе саветаў жанчыны—члены саветаў не нясуць ніякай нагрузкі; кіраўніцтва і дапамога яшчэ не наладжана як сьлед, арганізацыя жаночых сельскагаспадарчых нарад пры сельсаветах, якія дапамаглі-б узьняць прадукцыйнасьць жаночай працы, амаль не практыкуецца.

Палубец Аксіньня--член Тураўскага с|с

Шпаркія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, уцягненьне працоўных мас жанчын у прамысловасьць і вытворчую працу калгасаў патрабуюць выхаваньня з работніц, калгасьніц актыўных будаўнікоў сацыялістычнай гаспадаркі.

Раённыя выканаўчыя камітэты і сельсаветы павінны ўзмацніць масавую работу сярод жанчын—членаў саветаў, савецкага актыву, перадавых работніц, актыву калгасьніц шырокім уцягненьнем іх у практычную работу саветаў і выхаваньнем на гэтай рабоце ўсё новых кадраў жаночага кіруючага актыву, забясьпечыць арганізацыю і мабілізацыю ўсіх працоўных жанчын на пасьпяховае заканчэньне 4-га заключнага году пяцігодкі на выкананьне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва. **Майзіт.**

Часопісь „Работніца і калгасьніца" ў масы

Выклік прымаю

Я, рабкорка часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі", прымаю выклік работніцы нашай фабрыкі тав. Міндлінай па распаўсюджаньні часопісі і паведамляю, што мною ўжо завербавана новых 50 падпісчыц.

Са свайго боку я выклікаю рабкорак I-га і II-га агрэгатаў на 100 проц. ахоп падпіскай работніц гэтых агрэгатаў. Кожная работніца павінна чытаць сваю часопісь.

Падольская.

Абязуемся распаўсюдзіць 200 экз. часопісі

Агульны сход дэлегатак калгасу „1-га мая", Слуцкага раёну, заслухаўшы інфармацыю аб конкурсе па распаўсюджаньні часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі", пастанавіў **уключыцца ў конкурс і выклікаць на сацспаборніцтва ўсе дэлегацкія сходы гораду і раёну.**

Мы бярэм на сябе абавязак распаўсюдзіць 200 экзэмпляраў часопісі. На 15|II у нас распаўсюджана 115 экз. з падпіскай гадавой і поўгадовай.

Па даручэньні сходу: дэлегаткі **Кац і Ліўшыц.**

Уключаюся ў конкурс

Уключаюся ў абвешчаны конкурс на лепшае распаўсюджаньне часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" **і бяру на сябе абавязак распаўсюдзіць 100 экзэмпляраў.**

Выклікаю іншых рабкораў пасьледаваць майму прыкладу.

Ліпкіна.

Панчошная ф-ка
імя Клары Цэткін, Віцебск.

Асоавіяхімаўская арганізацыя ўключылася ў конкурс па распаўсюджаньні часопісі

Агульна - гарадзкая канфэрэнцыя працоўных жанчын Віцебску, разам з асоавіяхімаўскім актывам, пастанавіла: **уключыцца ў конкурс па распаўсюджаньні часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі"** і разгарнуць гэту работу так, каб кантрольную лічбу выканаць і перавыканаць.

Чырвонасьцяжная каманда № 1 (хэмічная) уключылася ў конкурс і падпісалася цалкам на 6 месяцаў на часопісь у колькасьці 101 экз. і выклікае на сацспаборніцтва 4 і 5 хэмкамандды. Дэлегаткі канфэрэнцыі ў колькасьці 18 асоб падпісаліся на 6 месяцаў, 4 асобы падпісаліся на 1 год.

Сход пастанавіў выклікаць асоавіяхімаўскі актыў іншых гарадоў БССР.

Кісялёва.

Крычаўскі раён разгарнуў працу па конкурсу

Крычаўскі раён уключыўся ў 2-хмесячнік штурму па распаўсюджаньні часопісі „Раб. і калг. Бел.". Пытаньне конкурсу прапрацавана на дэлегацкіх сходах у часе іх перавыбараў. Вылучаны ўпаўнаважаныя па зборы падпіскі з актыву калгасьніц і грамадчыц. **На нарадзе сакратароў партячэек,** дзе стаяла пытаньне аб падрыхтоўцы да 8-га сакавіка, **была завостpана ўвага на пытаньні распаўсюджаньня часопісі „Раб. і калг. Бел.".** Нарада пастанавіла прыняць усе захады для шырокай папулярызацыі часопісі сярод працоўных жанчын.

Сход жонак рабочых і служачых гор Крычава пастанавіў усім выпісаць часопісь і вылучаны 3 жанчыны ўпаўнаважаныя па зборы падпіскі. Зараз здана на пошту на 115 экз. 5-ці месячнай падпіскі.

Караваева, А.

ВУЧОБА ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН

Тав. Соўсьціна студэнтка станкоінструмантальнага інстытута на практыцы на заводзе „Чырв. Пролет.“

Поўнай ліквідацыяй агульнай і тэхнічнай няпісьменнасьці, уцягненьнем найбольшай масы працоўных жанчын у розныя віды вучобы, падрыхтуем новыя кадры кваліфікаваных работніц і калгасьніц

За актыўную дапамогу ажыццяўленьню 3-х усенавучаў

Тав Бандарэнка—культпрацаўнік ЖАКТу № 7 мае дасягненьні па ахопу няпісьменных жанчын.

Артыкул намесьнік Наркома Асьветы БРЫГНЕВІЧА

Міжнародны жаночы камуністычны дзень 8-га сакавіка праходзіць у гэтым годзе ў абставінах, калі рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, завяршыла пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

БССР у мінулым краіна сельскагаспадарчая, заняпалая, ператвараецца ў індустрыяльна-калгасную.

Размах сацыялістычнага будаўніцтва, супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў пасьпяховаму сацыялістычнаму наступленьню высоўвае праблему культурнай рэвалюцыі, як адну з важнейшых задач сучаснага гістарычнага пэрыяду.

БССР да Кастрычніцкай рэвалюцыі амаль няпісьменная ў сучасны пэрыяд ператвараецца ў краіну суцэльна-пісьменную, якая праводзіць тры ўсенавуча.

Першы ўсенавуч—школьны. Усе дзеці па БССР ад 8 да 15 год павінны навучацца і скончыць 4-х гадовую школу. У гарадох, прамысловых цэнтрах і некаторых раёнах усенавуч праводзіцца на базе сямігадовай школы, а спачатку 1932-33 навучальнага году ўсенавуч у БССР уводзіцца на базе сямігодкі для ўсіх дзяцей.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі—дзяўчынка ў школе адна на 5—7 хлапцоў, а зараз яна нараўне з хлапчукамі вучыцца.

Другі ўсенавуч — ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусь налічвала 20—22 проц. пісьменных. Ужо ў 1926 годзе процант пісьменнасьці падняўся да 40,7 проц.

Галоўная маса няпісьменных—жанчыны. На кожную сотню жанчын прыходзіцца пісьменных толькі 27. Сярод жанчын старэй 36 год пісьменных толькі 14 проц.

Рэканструкцыйны пэрыяд, росквіт індустрыялізацыі, бурны рост сацыялістычных форм у сельскай гаспадаркі, рост матар'яльнага становішча рабочай клясы, ліквідацыя беспрацоўя—усё гэта забясьпечвае бурныя тэмпы ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

У 1932 годзе мы маем па БССР пісьменных 80 проц.

Жанчыны складаюць асноўную масу ў лікпунктах. На лікпункт часта забіраецца кулак і агітуе супроць пісьменнасьці. У вёсцы навокал ліквідацыі няпісьменнасьці разгортваецца ўвесь час клясавая барацьба.

БССР павінна да 1-га мая 1932 году завяршыць зьнішчэньне няпісьменнасьці сярод астатніх 300 тысяч няпісьменных, ператварыўшы тым самым БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці. Імкненьне да навучаньня саміх няпісьменных, мабілізацыя культармії і яе вялікая напружаная праца, узросшая матар'яльная база — забясьпечваюць нам выкананьне гэтай вялізарнай задачы, пастаўленай партыяй.

Трэці ўсенавуч — дашкольнае выхаваньне. Да рэвалюцыі не існавала ніводнага дзіцячага саду для працоўных. У 1931 годзе 74 тысячы дашкольнікаў выхоўваліся ў дзіцячых садох. У 1932 годзе—неабходна ахапіць 316 тысяч дзяцей дашкольнымі ўстановамі — гэта задача вялізарнай палітычнай важнасьці.

Шырокае ўцягненьне ў вытворчасьць жанчын, поўнае і арганізаванае скарыстаньне жаночай рабочай сілы ў калгасах, мы лепш і з большым посьпехам ажыццявім, калі сваячасова будуць арганізаваны дзіцячыя пляцоўкі і дзіцячыя сады.

Савецкая ўлада ажыццявіла прававую роўнасьць мужчыны і жанчыны. „З тых законаў, якія ставілі

Калгасьніца навучаецца музыцы.

жанчыну ў становішча падпарадкаванай—у Савецкай краіне не засталося каменя на камені" (Ленін).

Працоўная жанчына ў нашай Савецкай краіне заваёўвае вышэйшыя ступені навукі і культуры ў масавым маштабе—гэта відаць з наступных лічбаў:

У навучальных установах, падпарадкаваных ВСНГ, навучаецца ў бягучым навучальным годзе жанчын: у ВТНУ—284, што складае 107,3 проц. агульнага складу студэнтаў гэтых устаноў, у рабфаках—636, у тэхнікумах—1199, у ФЗВ—2115, што складае 110,2 проц.

Па навучальных установах, падпарадкаваных Наркамзему, навучаецца жанчын: у ВНУ—540, у тэхнікумах—1015, у рабфаках—569.

Па сістэме Наркамасьветы навучаецца жанчын да 5000.

У сучасны момант усе сілы і энэргія рабочай клясы накіраваны на перабудову народнай гаспадаркі. **Дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны**—наша баявая задача. Зараз больш, як калі-б там ні было трэба ўцягнуць шырокія масы жанчын у вытворчасьць. Мы маем вялікія рэзэрвы, асабліва ў вёсцы, якія яшчэ ня прымаюць удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. **Забясьпечыць актыўны ўдзел жанчын у сацыялістычным будаўніцтве** – чарговая задача.

Да гэтага часу жаночая праца ўжывалася галоўным чынам у швэйнай, тэкстыльнай і керамічнай прамысловасьці. Зараз праводзіцца ў жыцьцё рад мерапрыемстваў па ўцягненьні жанчын у мэталюргічную, электратэхнічную, і інш. галіны прамысловасьці.

Пытаньне ўкараненьня жаночай працы ў прамысловасьць—пытаньне агульна-дзяржаўнага значэньня. Вось чаму **задача падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы з жанчын, перакваліфікацыя існуючых кадраў работніц—павінна прыкаваць увагу ўсіх партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый.**

Правільнае скарыстаньне жаночай рабочай сілы ў калгасах, падрыхтоўка і перападрыхтоўка калгасьніц для ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, у арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі—вялізарнейшая задача.

У гаспадарках ільнаводчых, жывёлагадоўчых, птушкаводных—праца калгасьніц адыгрывае надзвычайную ролю.

Нам трэба з асаблівай увагай аднесьціся **да падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў калгасьніц** для гэтых галін сельска-гаспадарчай вытворчасьці, а для гэтага нам трэба правесьці вялікую работу на працягу бліжэйшых дэкад і месяцаў.

Сярод работніц і калгасьніц асабліва востра стаіць пытаньне **ліквідацыі тэхнічнай непісьменнасьці.**

Найвялікшыя пэрспэктывы скарыстаньня жаночай працы, магчымасьць і неабходнасьць вылучэньня работніц і калгасьніц на кіруючую работу—патрабуе напруджаньня ўсіх сіл і сродкаў, каб канчаткова ліквідаваць спадчыну царызму—тэхнічную і агульную непісьменнасьць.

Усе зьвенъні сыстэмы народнай асьветы, уся сыстэма камуністычнага выхаваньня працоўных павінны быць накіраваны на мабілізацыю актыўнасьці працоўных жанчын, на выкананьне задач, пастаўленых плянам заключнага году пяцігодкі.

8-га сакавіка павінна даць новыя дзесяткі і сотні ўдарных жаночых брыгад і брыгад гаспадарча-разрахунковых.

Ленін гаварыў—„Сярод работніц і сялянак ёсьць у многа раз больш, чым нам вядома, арганізатарскіх талентаў, людзей, якія ўмеюць наладзіць практычную справу".—Наша задача іх выявіць склаўшы ўсе неабходныя ўмовы для поўнага скарыстаньня іх здольнасьцяў у сацыялістычным будаўніцтве.



Заняткі тэхгуртка на заводзе імя Пятроўскага.

Брыгада—асноўнае зьвяно калгаснай вытворчасьці

Правільная арганізацыя калгаснай працы, барацьба за стварэньне новай сацыялістычнай дысцыпліны і сацыялістычных форм працы (сацспаборніцтва і ўдарніцтва)—ёсьць адно з цэнтральных рашаючых зьвеньняў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Вырашэньне гэтай задачы непасрэдна ўпіраецца, перш за ўсё, у плянаваньне працы, у правільную растаноўку працоўнай сілы калгасаў ня толькі ў гаспадарцы, або ў пэўнай галіне гаспадаркі гэтых калгасаў, але і ўнутры асобнай вытворчай адзінкі—брыгады.

Зьяўляючыся часткай гаспадарчага арганізму ў цэлым, калгасная брыгада разам з тым ёсьць пэўная вытворчая адзінка, якая адказвае за вынікі, за якасныя і колькасныя паказальнікі сваёй дзейнасьці, якая ўдасканальвае і паляпшае адзіны плян усяго калгасу.

Калгасная практыка выявіла два тыпы брыгад у калгасах: спэцыялізаваныя і камбінаваныя (зьмешаныя брыгады). Спэцыялізаваныя брыгады арганізуюцца для выкананьня толькі аднаго віду работ (напрыклад, даеньне кароў, поліва гародаў і г. д.). Самы пашыраны тып брыгад—камбінаваныя брыгады, якія выконваюць усе работы на вучастку (ворыва, баранаваньне і сяўба, або касьба, вязаньне снапоў).

На практыцы ўсіх лепшых калгасаў брыгадная форма арганізацыі працы дала надзвычай добрыя вынікі. Вось чаму ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 4 II 32 году аб чарговых мерапрыемствах арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў падкрэсьлівае, што **„важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць брыгада"**.

Аднак, калгаснае сялянства ў значнай сваёй частцы не асвоіла ў належнай меры брыгады—як формы арганізацыі калгаснай працы, на практыцы да гэтага часу наглядаецца цэлы рад скажэньняў у прыстасаваньні асноўных мэтадаў арганізацыі працы ў калгасах.

Так, напрыклад, былі выпадкі арганізацыі брыгад па тэрыторыяльнай прымеце—гэта значыць брыгад дворак. Гэтыя брыгады зьяўляюцца шкоднай формай арганізацыі працы ў калгасах, якая не здавальняе патрабаваньням калгаснай вытворчасьці, не дае магчымасьці правільна расставіць людзей, рабочай жывёлы і машын паміж брыгадамі.

Брыгада-дворка выключае спэцыялізацыю, перашкаджае арганізацыі адыходніцтва і г. д. На жаль, яшчэ ў мінулую пасеўную кампанію шмат калгасаў не змаглі правільна арганізаваць брыгады. Па вестках з 5585 калгасаў відаць, што ў часе веснавой сяўбы былі арганізаваны брыгады-дворкі па 886 калгасах, і па 386 былі арганізаваны спэцыялізаваныя брыгады і брыгады-дворкі разам. Такім чынам, у 22,7 проц. усіх калгасаў існавалі брыгады-дворкі, якія перашкаджалі ў павышэньні вытворчасьці калгаснай працы (па матар'ялах рапартаў, справаздач на 1-VI 31 году).

Як правіла ні адна брыгада-дворка ня здолела поўнасьцю выкарыстаць наяўную рабочую сілу—коняй і сельгасінвэнтар. У гэтых брыгадах у сілу няправільнай іх арганізацыі наглядаецца слабы выхад калгасьнікаў на работу і слабае скарыстаньне рабочай сілы самых калгасьнікаў. Так, напрыклад, у калгасе імя Карла Маркса (Дубровенскі раён) у мінулым годзе ў сакавіку месяцы вышло на работу толькі 24 проц., у ліпені—59 пр., у верасьні—51 проц., у кастрычніку—21 проц. працаздольных калгасьнікаў. Пры такім невыстарчальным выхадзе на працу, прадукцыйнасьць працы калгасьнікаў была надта нізкай: па радзе работ норма выпрацоўкі сыстэматычна ня выконвалася.

Трэба самым рашучым чынам павесьці барацьбу з брыгадай-дворкай, барацьбу за перабудову брыгад па вытворчым прынцыпе.

Усе брыгады ў калгасах павінны быць пабудаваны выключна па вытворчым прынцыпе, з падборам калгасьнікаў для гэтых брыгад, па іх кваліфікацыі ў адпаведнасьці з характарам даручанай гэтым брыгадам вытворчай работы. Прымацаваньне да брыгады пэўных вучасткаў, у часе работы, коняў і інвэнтару—важнейшая ўлова ліквідацыі абязьлічкі ў калгасах.

У мінулую веснавую пасеўную кампанію з 5585 калгасаў 1407 зусім не замацоўвалі коняй ні за брыгадамі, ні за асобнымі калгасьнікамі—панавала абязьлічка. Яшчэ больш дрэнна стаяла справа з ліквідацыяй абязьлічкі ў жывёлагадоўлі: 2308 калгасаў, або 41,3 проц. зусім не замацавалі кароў за даяркамі.

На барацьбу з абязьлічкай трэба мабілізаваць усю калгасную грамадзкасьць на чале з праўленьнямі калгасаў і брыгадзірамі.

Для поўнай ліквідацыі абязьлічкі рабочай жывёлы трэба гэту жывёлу прымацаваць да адпаведных калгасьнікаў, якія павінны працаваць на гэтай жывёле ўвесь пэрыяд сельскагаспадарчых работ, несьці адказнасьць за становішча, нагляд і кармленьне гэтай жывёлы. Кожны конь павінен мець свой нумар, клічку, прымацаваную да яго вбрую, транспарт, машыны і г. д.

Колькасьць калгасьнікаў, цягавай сілы і інвэнтару ў вытворчай брыгадзе ў гэтую веснавую пасеўную кампанію павінна быць разьлічана, выходзячы з найбольшага павышэньня прадукцыйнасьці працы, правільнага выкарыстаньня коняй і машын і правядзеньня работ пры максымальным скарачэньні тэрмінаў веснавой сяўбы.

Практыка мінулага году пацьвердзіла, што найбольш мэтазгоднымі і прыстасаванымі да калгаснай вытворчасьці аказаліся брыгады з невялікім колькасна складам—у сярэднім 20—25 чалавек (у залежнасьці ад культуры, галін гаспадаркі, характару работы, складу машын і цягавай сілы).

У аснову ўсёй работы калгасаў павінны быць пакладзены добра распрацаваныя, даведзеныя да



Мітынг у калгасе „Случ", скліканы па пытаньню конкурсу нізавога друку, абвешчанага „Правдой".

кожнага калгасьніка вытворчыя пляны. У суровай адпаведнасьці з плянам павінны будавацца і калгасныя брыгады.

Трэба рашуча не дапускаць перакідкі брыгад, ня выканаўшых свайго вытворчага заданьня, з аднаго вучастку на другі, а таксама перакідкі паасобных калгасьнікаў і цягавай сілы з брыгады *ў брыгаду.*

Трэба, каб брыгада матар'яльна адказвала за посьпехі сваёй работы. Гэта адказнасьць павінна заключацца ў тым, што ацэнка працадня павінна павышацца або паніжацца ў залежнасьці ад посьпяховасьці работы брыгады.

Надзвычай важную ролю ў добрай рабоце брыгады адыгрывае брыгадзір, які зьяўляецца нізавым камандзірам калгаснай вытворчасьці. Брыгадзір, перш за ўсё,—арганізатар працы і калгаснай вытворчасьці ў сваёй брыгадзе. Ад брыгадзіра залежыць правільная расстаноўка на рабоце калгасьнікаў, мэтазгоднае выкарыстаньне цягавай сілы, машын, выкананьне агратэхнічных запатрабаваньняў, накіраваных на барацьбу за павышэньне ўраджаю і г. д.

Вось чаму галоўнейшым абавязкам праўленьняў калгасаў зьяўляецца падбор брыгадзіраў са складу лепшых калгасьнікаў і калгасьніц, асабліва ўдарнікаў, найбольш аўтарытэтных, ведаючых вытворчасьць і ўмеючых арганізаваць калгасьнікаў вакол выкананьня вытворчых заданьняў.

Трэба раз назаўсёды пакончыць з цякучасьцю, мэханічным падыходам і „чарговасьцю" ў назначэньні брыгадзіраў.

Неабходна аказаць сапраўдную дапамогу брыгадзірам у справе іх гаспадарчай і палітычнай кваліфікацыі. Неабходна ліквідаваць ураўнілаўку ў аплаце працы брыгадзіраў: „шырокае распаўсюджаньне павінна атрымаць ужо ўжываная ў мінулым годзе ў лепшых калгасах практыка аплаты працы брыгадзіраў у залежнасьці ад канчатковых вынікаў работы брыгады". (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4-II 32 году).

На ўвесь пэрыяд веснавой сяўбы ў кожнай брыгадзе складаецца план нарад, у якім прадугледжваецца разьмер заданьняў у брыгадзе, падрабязныя і якасныя паказальнікі па апрацоўцы і пасеве, склад брыгады, тэрмін выкананьня работы, парадак яе выкананьня і ацэнка яе ў працаднёх, парадак прэміяваньня за добрую работу і спагнаньня за дрэнную работу і г. д.

Для абслугоўваньня жывёлагадоўлі, пчалярства, птушніцтва, садоўніцтва і г. д. арганізуюцца спэцыяльныя брыгады па кожным відзе жывёлы і г. д.

У мінулым годзе многія калгасьнікі паказалі сапраўдныя ўзоры сацыялістычнай арганізацыі і повышэньня прадукцыйнасьці працы. Выкананьне вытворчых заданьняў 1932 году патрабуе новага ўздыму творчай ініцыятывы і актыўнасьці калгасных мас. Для гэтага неабходна шырока ўкараняць сацыялістычныя мэтады арганізацыі працы, арганізаваць сапраўднае ўцягненьне калгасьнікаў у сацспаборніцтва і ўдарніцтва, і прэміяваньне лепшых ударнікаў.

Асаблівую ролю ў справе разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы павінны адыграць вытворчыя нарады калгасаў. На жаль, гэтыя нарады яшчэ ня сталі сапраўднымі арганізатарамі калгасных мас у справе выкананьня вытворчых заданьняў. Вытворчыя нарады павінны быць арганізаваны ў кожнай вытворчай ячэйцы—у таварных фэрмах і г. д., а таксама ва ўсіх вытворчых брыгадах. **У тых галінах гаспадаркі, дзе мае пераважнасьць жаночая праца, а таксама і ва ўсіх жаночых брыгадах павінны быць арганізаваны спэцыяльныя жаночыя вытворчыя нарады.**

Асноўнай задачай вытворчых нарад зьяўляецца арганізацыя такой якасьці работы, вытворчасьці, каб забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў кожнай фэрмай, кожнай галінай гаспадаркі, кожнай вытворчай брыгадай у сурова ўстаноўленыя тэрміны і павышэньне якасных паказальнікаў—падняцьце ўраджайнасьці, прадукцыйнасьці, павялічэньне валавой і таварнай прадукцыі збожжа, тэхкультур і г. д.

С. К.

Калгасьніца-ўдарніца Новікава з калгасу „Случ" Слуцк. р.

Выданьне ЦК КП(б)Б. Адк. рэдактар Э. ШАПІРА.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 442 У ліку 20.000 экз. Галоўлітбел № 264